

Whiteruthein News Paper „The Fatherland" Authorized bu EUGOM Hq. Civil Affairs Division 1. January 1950, Nr. UNDP 225. Circulation 3500 copies, Responsible Publisher: WLADIMIR BORTNIK. Printed by Georg Jakob, München 8, Pütrichstr 3 a.
Administration Weisruthenischer Zeitung „Backauscun…" (13b) München-Feldmoching… Lager B. 140-6. US-Zone G…ny.

Цана 20 н. фэн., для заграніцы—50 н. фэн.

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND" | LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE" | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND"

№ 65 | 27 студзеня 1951 | ГОД ВЫДАНЬНЯ 4

Крывавы зьдзек над Беларускім народам

МАСКВА ПРЫЗНАЕЦЦА ДА РАССТРЭЛУ 13,325 БЕЛАРУСАУ

Для нас не сакрэт, што чырвоная Масква з мэтаю фізычнага вынішчэньня беларускага народу, побач зь іншымі жахлівымі спосабамі крывавага тэрору, практыкавала й практыкуе цяпер масавыя расстрэлы беларусау бязь ніякага суду ані доказу стаулянае ім віны. Масавыя расстрэлы ня у чым нявінаватых людзей на аснове аднастароньняе і у вадсутнасьці абвінавачанага прынятае тайнае пастановы НКВД — гэта адна з найбольш пашыраных праяваў савецкае «справядлівасьці»,

Але Масква, асабліва нам іжнародным грунце, катэгарычна аднекваецца ад падобных чынау, заяуляючы, што калі й здараюцца у СССР прысуды сьмерці, то бываюць яны вынесеныя згодна абавязваючых законау, г. толькі пасьля правядзеньня судовае працэдуры й дакладнага устанауленьня віны. І людзі, што жывуць у свабодных дэмакратычных дзяржавах, наіуна верылі у такія тлумачэньні Масквы, ня могучы навет уявіць сабе, каб у наш век можна было бязь ніякіх падставау і бязь ніякіх судовых працэдурау пазбауляць жыцьця ня у чым нявінаватых людзей,

Тымчасам тайныя арыгінальныя дакумэнты савецкай пракуратуры НКВД што папалі у рукі эміграцыйнага ураду БНР, апублікаваныя нядауна прэзыдэнтам БНР М. Абрамчыкам у выдадзенай ім у Канадзе брашуры у ангельскай мове п. п. «Я абвінавачваю Крэмль у забойстве майго народу». У гэтых тайных дакумэнтах Масква сама прызнаецца што на працягу толькі двух годоу (1937—38) было расстраляна на Беларусі 13.325 нявінных людзей.

Што-ж гэта за дакумэнты?

Есьць імі абшырны тайны пратакол ад 29 ліпеня — 2 жніуеня 1939 г. «Кантрольнай Камісіі», зложанай з памочніка пракурора Ленінградзкай Ваеннай Акругі Колакава, памочніка пракурора Беларускай ССР Дмітракова й Загадчыка Спэцыяльнай Першай Сэкцыі НКВД Беларускай ССР Гарбачэускага, якая, на загад пракурора СССР Панкрацьева ад 23 ліпеня 1939 г., выехала у Менск і правяла сьледзтва дзейнасьці былага заступніка пракурора Бяларускай Ваеннай Акругі А. Кісялева

Гэтая «Кантрольная Камісія» праверыла толькі акты, што знаходзіліся у Менску — у Спэцыяльнай Першай Сэкцыі НКВД БССР, і на падставе гэтага сьцьвердзіла наступнае (цытуем паводля Пратаколу):

«Перагляд наяуных альбомных даведак (г. зн. сьпісак-картатэк.—Рэд.) у Спэцыяльнай Першай Сэкцыі устанавіу што Кісялеу падчас усяго пэрыяду (г.зн. 1927—38 г. —Рэд,) падпісау 11.564 альбомныя даведкі (паводля загаду Но. 00485). Згодна іх было:

Прысуджаных да найвышэйшае меры пакараньня (г, зн. на кару сьмерці 11,009 асобау.

На разные терміны	379 асобау,
Звольнена	176 асобау,

Там-жа Кісялевым, у складзе Тройкі, было таксама падпісана прыгаворау на 3,045 асобу, зь якіх:

Прысуджана да найвышэйшае меры пакараньня (сьмерці)	2.316,
На розныя тэрміны	576,
Звольнена	154.

Гэта аднак яшчэ ня усе. Камісія, як сказана вышэй, задаволілася толькі праверкай тых справау, што знаходзіліся у Менскім НКВД. Як сьцьвярджае сама Камісія у сваім Пратаколе, «пададзеныя лічбы не адказваюць запраудна-му стану, бо вялікая колькасьць альбомных даведак знаходзіцца у Спэцы-

(Працяг на 4 балонцы)

САБОРНАЕ АРХІПАСТЫРСКАЕ ПАСЛАНЬНЕ

Божай міласьцю

Сьвяшчэнны Сабор Япіскапау Беларускае Аутакефальнае Праваслаунае Царквы на Чужыне

Да усечэснага Духавенства, прэпадобнага Манашаства й усіх Богалюбівых Вернікау БАПЦ на Чужыне.

Улюбленыя у Хрысьце дарагія браты й сестры!

«Слава на вышынах Богу й на зямлі мір сярод людзей добрае волі» (Лк. 2. 14).

Хрыстос раджаецца — радуйцеся! Хрыстос прыходзіць — Яго слауце! Няхай сьпяваюць душы й сэрцы Вашы песьню Ангелау у нябесах! Бо вось, сярод бурау і завірухау, гора і бяды нашага выгнанскга жыцьця зьяуляецца на небе нязвычайная — Віфлеемская Зорка, Яна сьветчыць па усей зямлі, што раджаецца Богачалавек — ХРЫСТОС.

Далека, далека ад Віфлеему тры валхвы-Мудрацы у розных, далекіх ад сябе краінах зь вялікім зьдзіуленьнем адначасна спасьцяраглі у цішы ночы Нязвычайную Зорку. Яна вабіла іх сваім цудоуным сьвятлом да сябе і яны пайшлі за Ею. Пайшлі, каб пабачыць, пакланіцца й шчодра абдарыць Таго, Хто толькі што нарадзіуся. Іх дары—золата, ладан і сьмірна былі дарамі ня толькі Чалавеку, але й Сьвятару й Валадару, былі дарамі — БОГАЧАЛАВЕКУ. Яны сьвята верылі, што настау Новы пэрыяд у жыцці людзей — пэрыяд Віфлеемскай Зоркі, Збавіцеля нашага. І яна прывяла іх да Яго — Дзіцятка у беднай Віфлеемскай пячэры. Мудрацы з глыбокай любоую сталі на калені перад Імі праславіушы Яго, з пачуцьцем радасьці й пацехі вярнуліся у свае краіны.

Адначасна сталася й другое нязвычайнае здарэньне. Віфлеемскім пастушкам зьявіліся сьвятыя Ангелы на небе й аавесьцілі ім радасную навіну нараджэньня Збавіцеля нашага й засьпявалі цудоуны гімн Яму й людзям — «Слава на вышынах Богу й на зямлі мір сярод людзей добрае волі». Пастушкі пасьпяшылі да ясьляу, каб пабачыць і пакланіцца Народжанаму Хрысту, Богу нашаму. Таксама ужо ад стагодзьдзяу сьпяшыць наш пабожны Беларускі Народ у гэтую Сьвятую Ноч да Храмау Яго, таксама становіцца на калені перад Ім і з радасьцю слухае цудоуныя словы Ангелау пастушкам: «І сказау ім Ангел: ня бойцеся! бо я вам абвяшчаю вялікую радасьць, што будзе усім людзям: бо цяпер нарадзіуся у Віфлееме Збавіцель, Каторы есьць Хрыстос Гасподзь» (Лк. 2, 10—11).

Гэтыя радасныя словы сьвятых Ангелау аб Нараджэньні Збавіцеля нашага глыбока жылі й жывуць у душах і сэрцах Беларускага Народу. Яны, як той, усякія болі аздарауляючы бальзам, стварылі чароуныя традыцыі нашага абходжаньня гэтага вялікага Сьвята. На Каляду, асабліва-ж вечарам, у душы і сэрцы кажнага з нас пануе цудоуная гармонія, зроджаная гімнам Ангелау у нябесах! Кажны Беларус удома сьпяшаўся у сваю родную хатку з пахушчым сенам на стале — праобразам ясьляу Дзіцятка, каб падзяліць радасьць сваю з сваіві любымі й найбліжэйшымі. у душах і сэрцах іх ужо быу Хрыстос, ужо абыймау іх Ласкою Сваею.

Нажаль, побач пастушкоу і Мудрацоу быу і Ірад. Ен плянавау ужо крывавы злочын супраць Народжанага Хрыста —Сонца Прауды й Справядлівасьці, Дабра, Радасьці й Шчасьця нашага. Але Дзіцятка разам з Прачыстаю Матуляй Сваей і Яе апякуном Іосіфам было цудоуна ўратаванае на выгнаньні. Ірад, аднак, лютавау і праліваў кроу нявінных дзетак. Паліліся патокі сьлезау няшчасных мацярок і збылося прароцтва Ерэміі «Голас у Раме чутны, плач науздрыд і лямант вялікі: Рахіля плача па дзецях сваіх і ня хоча уцешыцца, бо іх няма» (Ерэм. 31, 15). Але Ірад супакою не знашоу. Бог сурова пакарау яго.

Улюбленыя Браты й Сестры! Ці не перажываем мы цяпер падобныя часы? Адны ідуць сьледам пастушкоу і мудрацоу да Яго, Хрыста Бога нашага. Другія — сьледам Ірада, Першыя одчуваюць Боскі мір і любоу у сэрцах сваіх і сьпяваюць песьню хвалы Хрысту. Другія — нішчаць гэты мір, праліваюць рэкі крыві і сьлезаў кругом сябе і змушаюць мільёны ісьці на выгнаньне Але Ірад няслауна загінуу, а пасьля яго й шмат падобных яму. Разабьецца рассыплецца усякая сіла Ірадау, усякая сіла зла, усякая сіла дзьявала у змаганьні з воінствам Хрыста. Ен пераможна вярнууся з выгнананьня і скора пачалі узносіцца па усей зямлі Сьвятыні Яго; расьсяваючыя цудоуныя прамені Сьвятла, Ласкі, Любві, Радасьці й Шчасьця для людзей. Сьвятыні гэтыя сталіся крыніцаю жыцьцядайнай вады для прагнучых душау іх.

Улюбленыя! Мы, Беларусы, цяпер асабліва будзем дзякаваць Нованароджанаму Хрысту за Ягоную Ласку да нас, бо у шматлікіх краінах сьвету мы збудавалі ужо зь Яго дапамогай нашы уласныя Сьвятыні, нашы БАПЦэрквы. Таму у гэты вялікі Дзень Нараджэньня Збавіцеля нашага на каленях будзем дзякаваць й славіць Яго. Няхай наша любоу да Яго зазьяе яркім полымям і сваімі праменьнямі злучыць нас усіх, дзе бы мы не знаходзіліся. у вадну дружную, брацкую, Богалюбівую сямейку перад ясьлямі Нованароджанага Хрыста, Бога нашага.«Будзьце-ж адзін да аднаго добрымі. спагадлівымі, выбачаючымі адзін аднаму, як і Богу Хрысьце выбачыу вам» Эф. 4, 32).

Яднайцеся усе духам сваім з нашай сьвятой Беларускай Аутакефальнай Праваслаунай Царквой. Няхай Яна станецца нашым Амафорам. нашым Багаславенствам, нашым Збауленьнем. Нованароджаны Хрыстос, Збавіцель наш, паможа нам, каб гэтае наша, мілае Яму, Абъеднаньня пачулі Браты й сестры на нашай любай і пакутуючай яшчэ Радзіме, таксама духова злучыліся з намі у гэты Сьвяты Калядны Вечар і узмоцнілі сэрцы свае. Нованароджаны Хрыстос выслухае малітвы нашы й нашле нам далейшую Міласьць Сваю — паверне нас з нашага ВЫГНАНЬНЯ на нашу родную й вольную зямельку — БЕЛАРУСЬ.

З палымяннаю Верою у Міласердзе Божае, зь непарушнаю Надзеяю на Ласку Яго і шчыраю Любоую да Яго, вітаем Вас, улюбленыя Браты й Сестры зь вялікім Сьвятам РАЖСТВА ХРЫСТОВАГА й з надыходзячым НОВЫМ ГОДАМ. Будзем маліцца да Яго, Нованароджанага Хрыста, Бога нашага, каб Ен выслухау просьбы нашы—памог нам сьвяткаваць і славіць вялікі Дзень Нараджэньня Яго у наступным годзе ужо пад нашым родным небам, у нованароджанай, слаунай і вольнай Беларусі нашай.

Пасылаем усім Вам нашае Архіпастырскае Багаслауленьне. Узмацняйце й паглыбляйце Веру у Хрыста й сьвяты Крыж Яго у сэрцах Вашых. Няхай Віфлеемская Зорка станецца нашым правадніком на выгнаньні і дасьць нам шчасьце тут на зямлі й вечнае блажэнства на Небе.

«Урэшце, браты, радуйцеся, рабецеся дасканалымі, пацяшайцеся, будзьце аднадумнымі. у згодзе—і Бог любві і міру будзе з вамі. Ласка Госпада нашага Ісуса Хрыста і Любоу Божая і лучнасьць Сьвятога Духа з усімі вамі. Амінь». (2 Кар. 13.11.13).

СЬМІРЭННЫ АРХІЯПІСКАП СЕРГІЙ

Глава Сьвяшчэннага Сабору Япіскапау Беларускае Аутакефальнае Праваслаунае Царквы

СЬМІРЭННЫ ЯПІСКАП ВАСІЛІ

Сакратар Сьвяшчэннага Сабору Япіскапау БАПЦ на Чужыне.

Дана Року Божага 1950,
месяца сьнежаня,
Аустралія—Нямеччына.

Будзьма гатовымі!

З мамэнтам збройнага выступленьня чырвонага Кітаю на Далекім Усходзе вупраць сілау Задзіночаных Нацыяу распачалася новая фаза ня толькі у вайне у Карэі, але і у палітычнай сытуацыі цэлага сьвету Гэта абазначае ня больш і ня менш, як тое, што Карэйская вайна ізь лякальнага канфлікту, які дзякуючы удалай афэнзыве збройных сілау ЗН быу блізкі поунай ліквідацыі ператварылася у падзею сусьветнага значэньня. Праступны камунізм, які есьць ініцыятарам і рэжысэрам вайны на усходзе й якому усе-ж такі удалося піхнуць у яе Кітай Мао-Тсэ-Тунга, узмацняе сваю правакацыйную дзейнасьць у цэлым сьвеце з мэтаю дасягненьня поунае перамогі над дэмакратычным Захадам.

З другога боку й дэмакратычны Захад, а у першую чаргу Амэрыка, сяньня ужо зразумеу усю сутнасьць маскоускага камунізму й вызбыуся амаль поунасьцю зманлівых ілюзыяу, што коштам бесьцерапынных уступак і кампрамісау можна будзе наладзіць супрацоуніцтва з Савецкім Саюзам і такім чынам захаваць мір.

Узаемадачыненьні паміж дэмакратычным Захадам і камуністычным Усходам сяньня настолькі напружаныя, палітычная сытуацыя сьвету настолькі скамплікаваная й заблытаная, што ня відаць аніякае магчымасьці, каб сяньняшняе міжнароднае палажэньне магло быць унармаванае й устабілізаванае мірным шляхам. Чырвоная Масква здабываецца на што раз новыя правакацыі супраць Захаду, і мамэнт генэральнага збройнага зудару набліжаецца зь нябывалай хуткасьцю.

Вось-жа гэтая акалічнасьць ускладае й на нас беларусау асаблівыя абавязкі, вызначае нам нязвычайна важныя нацыянальныя заданьні Бо ня трэба й даказваць, што вольнасьць і незалежнасьць нашае Бацькаушчыны можа быць адваяваная толькі у выпадку сусьветнага канфлікту, у выніку якога быу-бы зьнішчаны маскоускі бальшавізм, Але зьнішчэньне бальшавізму яшчэ не абазначае вызваленьня нашага народу й адбудаваньня незалежнасьці нашага Краю.

Ня есьць ніякім сакрэтам, што апрача бальшавіцкага імпэрыялізму дзеяць сяньня іншыя імпэрыялізмы, выразна накіраваныя супраць вольнасьці й не-

(Працяг на 4 балонцы)

Гэтак есьць у Савецкім Саюзе!

АД РЭДАКЦЫІ: Пад гэткім загалоукам зьмяшчае «АБН—Карэспандэнцыя» у Но. II свайго нямецкага выданьня за лістапад 1950 г. аутэнтычнае апісаньне цяперашняга палажэньня у Савецкім Саюзе, атрыманае нелегальнай дарогай ад прадстаунікоу украінскага руху супраціву на бацькаушчыне. Перадрукоуваем яго тут у скарачэньні, так як гэтае апісаньне зьмяшчае у сабе шмат цікавых інфармацыяу аб умовах жыцьця у Савецкім Союзе наагул, у тым ліку й у Беларусі.

Сацыяльная Няроунасьць

Вялікая сацыяльная няроунасьць ня кідаецца нідзе гэтак у вочы. як іменна у краіне перамогшага «сацыялізму». Прычынамі такога стану есьць:

а). Імкненьне да што раз новых і новых заваяваньняу, у сувязі зь якім праводзіцца вялізарнае разбудаваньне ваеннай прамысловасьці. На гэтыя мэты з савецкага грамадзяніна выціскаецца апошні рубель пры помачы непамерных падаткау, пазычак, адлічэньняу і інш.

б). Фінансаваньне пятых каленау заграніцай. Дзеля пашырэньня камуністычных уплывау у цэлым сьвеце Масква змушаная выдаваць вялізарныя сумы на камуністычную акцыю у кажнай краіне сьвету ды аплачваць цэлую армію яуных і замаскаваных сваіх агентау.

в). Сьведамае трыманьне масау на нізкім жыцьцевым узроуні пры адначасным высокім штандарце жыцьця кіруючай клікі. Гэта дзеіцца па тое, каб з аднаго боку вытварыць кліку людзей, што была-б узапрауды задаволенай зь існуючага палажэньня й была-б гатовай абараняць савецкую сыстэму пры кажнай акалічнасьці, а з другога, каб масы народу былі занятыя здабыцьцем куска штодзеннага хлеба й ня мелі зусім часу ані ахвоты змагацца зь існуючым палажэньнем.

г), Голад і галіта зьяуляюцца аружжам, пры помачы якога савецкія валадары трымаюць у паслухмянасьці народныя массы. Так як усе сродкі вытворчасьці й прадукты зьяуляюцца у выключным веданьні дзяржаунага апарату, можа ен імі свабодна распараджацца, не бяручы пад увагу запраудных патрэбау народу.

Чацьвертая Пяцігодка

Чацьвертая пяцігодка, званая яшчэ генэральнай пяцігодкай адбудовы й далейшай разбудовы савецкай народнай гаспадаркі пасьля другой сусьветнай вайны, праводзіцца вельмі паволі й зь вялізарнымі перашкодамі, ні гледзячы навет на тое, што бальшавікі бязьлітасна абрабоуваюць акупаваныя імі пасьля вайны краіны. Вялізарны плян адбудовы ня служыць аднак запраудНай адбудове зьнішчаных войною заходніх нерасейскіх краеу, сколькі далейшай разбудове цяжкой і ваеннай прамысловасьці у акругах, што ані трохі не пацярпелі ад вайны, як Урал і Сібір. Слова «адбудова» скарэй за усе ужываецца па тое. каб можна было ставіць яшчэ большыя вымаганьні ад народных масау ды задакумантаваць навонкі «мірную» палітыку Саветау. Бо для запраудНай адбудовы зьнішчаных вайною нерасейскіх тэрыторыяу зроблена дасюль вельмі мала а калі й праведзеныя некаторыя адбудавальныя работы, дык гэта толькі тыя, якія необходна былі патрэбныя для эксплуатацыі гэтых земляу. Таксама не апраудауся пагляд, што гэтую пяцігодку удасца выканаць у чатыры гады. Із што раз большымі цяжкасьцямі могуць быць сьцягваныя розныя пазыкі ад насельніцтва, што праводзяцца кажны год для латаньня дзюрау у савецкім бюджэце. І што асабліва цікава, дык гэта тое, што абяднелыя савецкія масы часта адкрыта ужо адмауляюцца даваць гэтыя пазыкі.

Русыфікацыя усьцяж павялічваецца

Пачынаючы ад тосту Сталіна за здароуе расейскага народу, як вядучай перадавой нацыі Савецкага Союзу, а канчаючы лемантаром ува усіх школах, русыфикацыя праводзіцца усюды бясьперапынна. Уся бальшавіцкая прапаганда намагаецца угаварыць, што усе чыста, што творыцца расейцами, есьць узорным і найлепшым у целым сьвеце,яна стараецца перакanаць, што бадай усе важнейшыя сусьветныя вынаходы былі даканаНыя расейскими вучонымі і што усе тое, што даканали у гэтай галіне усе іншыя народы, было ня чым іншым, як пазьнейшым пераняцьцем расейскіх перг аузорау.

Гэтыя імкненьні бальшавіцкай прапаганды адчуваюць вельмі балюча усе народы, паняволеныя Масквой. Расейска-бальшавицкая паліцыйная машына не дазваляе найменшага праяуленьня нацыянальнай самабытнасьці нерасейскіх народау, навет у тых выпадках, каля гэта тычыцца толькі культурнага жыцьця. Некаторыя меншыя народы сьціраюцца фізычна з абліччa зямлі, як прыкладам, Крымскія татары, калмыкі, Каукаскія плямены чэчэнцау і інгушау, якія перасяляюцца масава у пауночны Сібір, дзе сама прырода й суровы клімат выклікаюць іхнае хуткае выміраньне.

Іншыя ж, большыя народы, што вызначаюцца вялікай палітычнай актыунасьцю, праходзяць даужэйшы працэс г.зв. пераузгадаваньня. Інтэлігенцыя гэтых народау фізычна ліквідуецца пры помочы ссылак, прымусовых работ, голаду й звычайнага морду. Рэшта-ж народу пляНава русыфікуецца пры помачы расейскай калянізацыі, школы, службы у арміі й цэлым радам іншых выпрабаваных бальшавікамі спосабау. Гэткая сыстэма русыфікацыі й фізычнага вынішчэньня народау практыкуецца асабліва на Украіне, Беларусі, Прыбалтыцы Каукaзе й Туркестане.

Г. зв. нацыянальныя рэспублікі сталіся ужо да рэшты толькі адміністрацыйнымі часткамі расейска-бальшавіцкай імпэрыі і ня маюць найменшае магчымасьці заспакаеньня нацыянальных патрэбау сваіх жыхароу.

А тэрор шалее...

Апошнім часам тэрор асабліва завастрыуся у кажнай галіне жыцьця. Бальшавікі адкрыта гавораць аб хуткай вайне, у сувязі з чым прыгранічныя округі старанна ачышчаюцца ад ненадзейных элемэнтау, якія у часе вайны маглі-б збройна выступіць супраць бальшавіцкіх акупантау. Такім чынам масавые арышты й ссылкі зьяуляюцца там цяпер на парадку дзенным. Завастрэньне тэрору зауважаецца й у турмах і лагерах, у арміі й індустрыі, у калгасах і наагул усюды там, дзе шэры савецкі чалавек спатыкаецца з прадстаунікамі улады. Гэты терор, апрача ліквідацыі непажаданых бальшавіком людзей, мае яшчэ на мэце выклікаць у людзей паВуцьце вечнага страху, адабраць ад іх чалавечую годнасць ды зрабіць іх бязвольным аружжам у руках партыі і улады.

Расейскі Шавінізм і Імпэрыялізм

Трэба тут адзначыць два галоуныя мамэнты, што спрычыніліся у вялікай меры да узмацненьня расейскага шавінізму у нутраных дачыненьнях і імпэрыялізму у дачыненьнях вонкавых:

1. Здабыцьце Саветамі сакрэту прадукцыі атамнае бомбы.

2. Падпісаньне у палавіне лютага 1950 г. умовы між СССР і чырвоным Кітаем.

Бальшавікі не занядбалі, каб шырака ня выкарыстаць гэтых фактау у сваей прапагандс. Калі яны заяуляюць навонкі, што атамная энэргія будзе імі выкарыстоуваная толькі для мірных мэтау, то у сакрэцэ яны старанна пры гатауляюць атамную зброю, каб пры ейнай помачы ажыцьцявіць свае імпэрыялістычныя мэты. Умова з камуністычным Кітаем дае ім між іншым шырокія магчымасьці павялічэньня работніцкай сілы унутры краю, як і умацаваньня свайго палітычнага значэньня навонкі. Цэлага паумільена кітайцау мае ужо цяпер працаваць у прамысловай Кузьнецкай акрузе. Гэтыя іхныя дасягненьні узмоцнілі нагласьць Саветау, і яны могуць выклікаць яшчэ большае напружаньне у міжнародных дачыненьнях.

Калгасы-гіганты й агра-гарады

Цяпер у Савецкім Саюзе пасьпешна разбудоуваюцца г. зв. калгасы—гіганты й агра-гарады. Новая гэтая палітыка у савецкай калектыунай гаспадарцы мае на мэце зьліквідаваньне дасюлешніх невялікіх калгасау і сялянскіх весак разам з рэштай сялянскай прыватнай собскасьці й стварэньне на іх месцы г. зв. калгасау—гігантау і агра-гарадоу дзе маюць жыць калгасьнікі. Гэтае злучаньне калгасау афіцыяльна мае на мэце цэнтралізацыю кірауніцтва калгасау і даць лепшую магчымасьць прымяненьня вялікіх сельскагаспадарскіх мащынау. Аднaчасна калгасьнікі маюць пакінуць свае калгасныя вескі й быць сказармаванымі у вялікіх, спэцыяльна для гэтая мэты збудаваных, агра-гарадох.

За вышэйуспомненымі афіцыяльнымі бясспрэчна хаваюцца й інцыя мэты такой рэарганізацыі калгаснай структуры. Не падлягае сумліву, што гэтая рэарганізацыя зьнішчыць апошнія рэшткі прыватнай собскасьці калгасьнікау, спрычыніцца да яшчэ большай эксплуатацыі й так непамернай працы калгаснага сялянства ды завядзе яшчэ большы палітычны кантроль і дысцыпліну сярод калгасьнікау. Апрача гэтага казармаваньне калгасьнікау нерасейскіх народау бясспрэчна мае на мэце прысьпешыць працэс іхнае русыфікацыі.

Нявольніцкая праца

У Савецкім Саюзе, які называе сябе краінай «перамогшага сацыялізму», вольная праца людзей адсутнічае. Прыкладам, у сельскай гаспадарцы кажны калгасьнік есьць забавязаны выканаць свой працоуны мінімум, які складаецца із адпаведнае колькасьці працаднеу у год. Той самы прымус існуе таксама у прамысловасьці й іншых галінах вытворчасьці. Работнік ня мае права ані выбіраць ані зьмяняць роду й месца працы. Найменшае спазьненьне на працу караецца, як ведама, судом з найвялікшай суровасьцю. Заработная плата есьць на столькі нізкая, што такі стан можа быць утрыманы толькі пры помачы прымусу. Лягеры прымусовай працы існуюць ня толькі дзеля атрыманьня дармовай працоунай сілы, але й з мэтаю маральнага й фізычнага зьнішчэньня нявыгадных Саветам многіх мільенау людзей. Таму гэта ня толькі працоуныя лягеры. але й аднaчасна фабрыкі сьмерці у найпраудзівейшым значэньні гэтага слова.

ПАЧАТАК ДРУКАРСТВА У БЕЛАРУСІ

Да 425-лецьця нашай друкарні

(Пачатак у № 64 за 1950 г.)

У 1517 г., 6 жніуня, у Празе і выходзіць першая кніга Скарынавай Бібліі—«Псалтыр». Гэта кніга і есьць першаю беларускаю друкаванаю кнігаю. Дык пачатак нашага друку адносіцца да 1517 г. Але друк гэты выконвауся не у Беларусі, а на чужыне, у Чэхах. Пачатак-жа друкарства у самой Беларусі, адкрыцьце першай у нас друкарні, было 8 гадоу пазьней, у Вільні. Вось гэтыя другія угодкі друкарства на Беларусі, а не пачатку беларускага друку наагул, і абходзіць селета беларуская эміграцыя.

Біблію у Празе Скарына друкавау ад 1519 г. Друкавау ен яе паасобнымі біблійнымі кнігамі. Паводля прыпіскі да аднэй з гэтых кніг мусілі быць выдадзены у гэтым часе усе біблійныя кнігі Старога і Новага Запавету. Але кнігі гэтыя пазьней, асабліва у пару рэлігійных змаганьняу у Беларусі у XVII ст. былі моцна вынішчаныя, і таму сяньня асталіся толькі паасобныя эгзэмпляры некаторых з гэтых кнігау. Да гэтай пары знойдзеныя 22 кнігі з 77 усей Бібліі. Яны сяньня перахоуваюцца як вялікая й кaштоуная рэдкасьць у музэях і бібліятэках эуропы. Найбольш гэтых кнігау, бо 17, мае быць у Бібліятэцы Брытанскага Музэю у Лендане.

За узор пры перакладаньні на беларускую мову Бібліі Скарына меу выданыя перад ім друкам пераклады Гутэнбэрга панямецку і пераклад чэскі Міколы Лірана з 1506 г. Што робячы свой пераклад, Скарына карыстауся з чэскага перакладу Лірана, відаць з таго, што у ягоным перакладзе часам сустракаюцца і чэскія словы, і якраз тыя, якіх і Лiран ужыу у сваім перакладзе.

Папрацавaушы так найменш добрыя тры гады над друкаваньнем кніг у Празе, Скарына пачынае непакоіцца. Яго карціць вярнуцца на сваю бацькаушчыну, каб там далей весьці распачатую вялікую працу.

Мучае яго й туга за роднай зямлей. Ужо цэлых пятнаццаць гадоу патраціу ен на вандроуку па чужых краінах, каб здабыць патрэбную сабе веду ды навучыцца друкарскага майстэрства. Дык пара ужо і вярнуцца дамоу—зь ведаю, доктарскімі тытуламі, кнігамі, ды неабходным для далейшай друкарскай працы шрыфтам.

Што Скарына добра знау, што значыць туга за сваей роднай зямлей, аб гэтым сьведчаць вось гэтыя ягоныя радкі з прадмовы да кнігі »Юдыт»:

«Таму, што ад прыраджэньня зьвяры, хадзячыя у пустыні, знаюць ямы свае, птушкі летаючыя па паветры, ведаюць гнезды свае, рыбы плаваючыя па моры і рэках, чуюць віры свае, пчолы і тым падобнае бароняць вульлеу сваіх,—тако-ж і людзі, дзе зрадзіліся і ускормленыя суць па Бозе, к таму месцу вялікую ласку маюць».

Вось гнаны гэтаю натуральнаю любоую да свайго роднага краю, Скарына зьбірае свае друкаваныя кнігі, шрыфт, ды неабходныя для друку прылады ды едзе з Прагі дамоу.

Паводля некаторых вестак, Скарына едзе дамоу праз Нямеччыну і па дарозе наведвае ведамага рэлігійнага рэфарматара Марціна Лютэра у Вітэнбэргу, які тады ужо стау слауным сваім вострым выступленьнем супраць папы. Дзеля гэтых адведзінау у Лютэра нямецкія каталіцкія манахі абвінавацілі яго у тым, што ен стау староньнікам Лютэра. Паручыла яму аднак у канцы апраудацца і выйсьці з турмы. Але падчас гэтага няпрыемнага здарэньня пагінула шмат ягоных кнігау, якія былі зьнішчаныя, як падазроныя у ерасі.

У 1520 г Скарына ужо у Вільні, у сваіх прыяцеляу і матарыяльных апякуноу ягонай выдавецкай працы. Былі гэта Віленскі бурмістр Якуб Бабіч і райца Багдан Онькау. Пры іх помачы ен і бярэцца за арганізацыю першай друкарні на нашых землях, якая знаходзілася у доме бурмістра Бабіча.

Вось вынікам гэтай працы й было паяуленьне у 1525 г. успомненага на пачатку «Апостала». У тым-жа годзе выходзіць і другая кніга—«Малая Падарожная кніжыца», у якой быу зьмешчаны псалтыр з праскай Бібліі і апрача таго Часасловец, Акафісты, Шастаднеу і Саборнік (сьвятцы).

Усе Скарынавыя выданьні азначаюцца вялікаю дбайнасьцю аб іх вонкавы выгляд і хараство. З тэхнічна-графічнага боку, як на гэныя часы, ягоныя кнігі стаялі вельмі высака й цаніліся знатакамі друкарскай справы. Азначаліся яны перадусім прыгожым кроем літарау, былі аздобленымі шматлікімі застаукамі, завіточкамі, размаляванымі калярова пачатнымі літарамі. Праскія кнігі Бібліі былі да гэтага яшчэ ілюстраванымі мастацка цікавымі малюнкамі—гравюрамі. У Бібліі быу зьмешчаны й партрэт самога Скарыны.

Аднак Скарынавыя лятуценьні аб разгарненьні шырокай выдавецкай працы на бацькаушчыне ня збываюцца. Ягоная друкарня доуга не утрымалася Даходы з прадажы кніжак ня былі адпаведна вялікія, каб пакрыць усе патрачаныя кошты. Ды нічога у гэтым няма й дзіунага. Із стараны магнатау і духавенства ен ня мае ніякага падтрыманьня. Ен-жа ім кніг і ня друкуе. Народ-жа, якому ен прысьвячае усю сваю крапатлівую працу, кніжак гэтых купляе мала дзеля тэй простай прычыны, што ен найчасьцей яшчэ няграматны Школы для народу—тады яшчэ вялікая рэдкасьць.

На завяршэньне няшчасьця друкарню нішчыць пажар, у якім гінуць і усе прылады ды прыгатаваны марудНаю працаю шрыфт. Скарына пападае у паважныя грашовыя клопаты. Ягоныя даужнікі валочаць яго па судох. Ен наканец змушаны кінуць Вільню, тую Вільню, у якую перад некалькімі яшчэ гадамі вяртауся з чужыны зь немалымі плянамі і надзеямі аб разгарненьні й завяршэньні сваей вялікай працы для народу «паспалітага».

Гэты раз Скарына накіроуваецца у Прусы, у Каралевец, да прускага караля Альбрэхта, які цаніу вучоных людзей, ахвотна гуртавау іх каля сябе й думау аб залажэньні у Каралеуцы унівэрсытэту. У Каралеуцы ці дзе у іншым месцы дажывау Скарына свае гады, і калі і дзе ен памер, расчараваны няудачамі сваей працы, на якую аддау добрых пару дзесяткау сваіх найлепшых маладах гадоу,—няма, нажаль, ніякіх вестак.

Ня гледзячы аднак на усе няудачы, Скарынавая праца мела вялікае значэньне. Яму было суджана быць тым апосталам друкарства, ад якога пазь-

Як адбываюцца арышты у саветах?

У брашуры сп. прэзыдэнта М. Абрамчыка «Я абвінавачваю Крэмль у забойстве майго народу», аб якой гутарыцца шырэй на іншым месцы гэтага нумару газэты, зьмешчаны яшчэ адзін вельмі цікавы дакумэнт, які паказвае, што кантынгенты арыштаваных для кажнай нацыянальнай рэспублікі зауседы Масква вызначае згары, падаючы пры гэтым і нацыянальны склад людзей, што маюць быць арыштаванымі. Вось даслоуны тэкст гэтага дакумэнту:

«У ОГПУ (НКВД) Менск. Тэлеграма. Верасень 23,1929, Масква». Прыгатуйце 5.060 вязьняу: 100 расейцау, 1500 палякау і рэшту беларусау. ОГПУ (НКВД) Масква».

Гэта між іншым выясьняе нам, дзеля якой мэты пракурор Беларускай Ваеннай Акругі А. Кісялеу у вельмі многіх выпадках зьмяняу вацыянальную прынадлежнасьць арыштаваных ім людзей зь беларускае на польскую (артыкул—«Крывавы зьдзек над беларускім народам»), Значыцца у дадзеным яму тады заданьні маскоускім НКВД патрабавалася арыштаваць палякау большую колькасьць, чымсьці мог ен набраць, але гэтае заданьне выканау у 100 проц. згодна савецкай практыкі, зьмяняючы нацыянальнасьць зь беларускай на польскую.

Да падпішчыкау «Бацькаушчыны»

Паколькі наша газэта не атрымлівае жадных супсыдый збоку, а трымаецца толькі на уласных сродках і ахвярнасьці таго невялічкага нацыянальнага актыву, які жыве яшчэ у нямеччыне, адміністрацыя «Бацькаушчыны» гэтым зьвяртаецца да усіх падпішчыкау з просьбай сваечасова разьлічвацца з газетай, а тых, хто мае запазычанасьць—ліквідаваць яе, як мага хутчэй.

Грошы, як за газэту, так й ахвярные просім высылаць на адрыс адміністрацыі «Бацькаушчыны» беспасярэдне.

Адміністрацыя.

НЕАБАСНАВАНЫЯ ПРЭТЭНСІІ

Польскія палітычныя дзейнікі на эміграцыі розных кірункау, а у першую чаргу польскі эміграцыйны урад у Лендане у сваіх імкненьнях да адбудаваньня незалежнае Польшчы дамагаюцца ня толькі утрыманьня земляу «адзысканых» на Захадзе, але й прылучэньня да яе земляу Заходняй Беларусі й Заходняй Украіны на Усходзе, страчаных у выніку апошняе вайны. Гэтае дамаганьне было галоуным зьместам польскае замежнае політыкі, але апошнім часам прапаганда за уключэньне гэтых земляу у склад будучае Польшчы што раз больш узмацняецца. Як ведама, існуе у Лендане г. зв, «Зьвензэк» Зем Полноцно—Всходніх», заданьнем якога й есьць прапагаваньне гэтага дамаганьня, як сярод польскага эміграцыйнага грамадзянства, гэтак і перад заходнім сьветам. Апошнімі месяцамі адведау ЗША й Канаду бышы каманд зір бышага другога польскага корпусу генэрал В. Андэрс, які у сваіх прамовах у розных польскіх асяродзьдзях паклау асаблівы націск па тое. што Польшча ня толькі у Варшаве, але й у Вільні і Львове. Гэтак сама й польская эміграцыйная прэса узмоцніла прапаганду за зварот Польшчы Заходняй Беларусі й Заходняй Украіны.

Есьць фактам бясспрэчным, што польская прапаганда за прывярненьне усходніх граніцау з 1939 г. ня есьць прыпадковым зьявішчам ані работай толькі некаторых кругоу польскага грамадзянства, але абдуманай і сыстэматычнай акцыяй, праводжанай усімі польскімі палітычнымі угрупаваньнямі, што гуртуюцца вакол польскага эміграцыйнага ураду у Лендане,

Так як гэтае пытаньне непасрэдна закранае нашыя нацыянальныя інтарэсы й есьць пасягаьнем на цэласьць і незалежнасьць нашае бацькаушчыны, мы ня маем права абыйсьці яго моучкі. Наадварот! У гэтай справе мы павінны забраць голас. каб, задэкляравaушы нашае становішча, павесьці староукую акцыю абароны перад польскім імпэрыялізмам.

У першую чаргу мусім аб'ектыуна й усебакова разважыць, ці і на колькі польскія прэтэнсыі есьць абаснаваныя з кажнага магчымага пункту гледжаньня. Тут мусяць узятыя пад увагу тры наступныя мамэнты, што маглі-б або абаснаваць польскія прэтэнсыі, або паказаць усю іхную беспадстаунасьць. Есьць імі мамэнт гістарычна-прауны, этнаграфічны ды, напасьледак, мамэнт палітычны. Разгледзім кажны зь іх асобна.

1. МАМЭНТ ГІСТАРЫЧНА-ПРАУНЫ

З гледзішча гістарычнага Беларусь аж да 1921 г. ніколі ня была складоваю часткаю Польшчы. Творачы у мінуушчыне сваю незалежную дзяржаву—Вялікае Княства Літоускае, была яна на працягу стагодзьдзяу зьвязна з Польшчаю спачатку свабоднейшай, а потым цясьнейшай дабравольнай фэдэральнай сувязьзю, але як Беларусь, гэтак і Польшча зауседы выступалі, як два раунапрауныя сябры супольнай уніі. Праўда, Польшча зауседы імкнулася адыгрываць кіраунічую ролю у гэтай задзіночанай дзяржаве, праўна аднак Беларусь ніколі ня была падпарадкаванай Польшчы, ня была ейнай складовай часткай, Такі стан трывау да 1795 г.—да г. зв. трэйцяга разьдзелу Польшчы, калі уся Беларусь і частка Польшчы апынуліся пад панаваньнем Расеі.

І толькі ад 1921 г. на падставе рыскага трактату заходняя частка Беларусі становіцца складовай часткой польскае рэспублікі На пастановах рыскага трактату галоуна й апіраюць палякі свае прауныя прэтэнсыі на заходня-беларускія землі.

Але рыскі трактат быу заключаны ня толькі бяз згоды беларускага народу, але навет бяз удзелу ягонага прадстауніцтва. Беларускі народ. абвесьціушы актам 25 сакавика 1918 г. сваю дзяржауную незалежнасьць і ахвярна бароньячы сваю маладую рэспубліку перад варожымі сіламі з Усходу й Захаду, найлепей задакумэнтавау сваю волю быць адзіным і паунапрауным гаспадаром на сваей собскай зямлі. Таму уключэньне Заходняй Беларусі у склад польскае дзяржавы было насільным актам акупацыі, такім самым, як і прылучэньне цэнтральнай і усходняй Беларусі да бальшавіцкае Расеі.

Той факт, што пастановы рыскага трактату былі потым вызнаныя дзяржавамі Захаду, ня мае ужо сяньня ніякага праунага значэньня. бо тымі-ж самымі дзяржавамі былі пазьней вызнаныя й пастановы Ялты й Тэгэрану, на моцы якіх заходня-беларускія й заходня-украінскія землі, хаця абрэзаныя лініяй Кэрзона, змадыфікаванай Сталінам на карысьць Польшчы, былі зьвернутыя назад Беларусі й Украіне. Гэтым актам заходня - дэмакратычны сьвет перакрэсьліу рыскі трактат, прызнаючы яго няважным.

Іншая справа, што уключаючы заходня-беларускія землі у склад БССР, заходні сьвет кінуу іх у яшчэ цяжэйшую бальшавіцкую няволю, прауна аднак гэтыя пастановы былі зусім мэтазгодныя, бо яны злучалі у вадно цэлае парэзаныя штучна на часткі беларускія землі.

Адсюль ясна, што ані гістарычных, ані прауных падставау на зварот заходня-беларускіх і заходня-украінскіх земляу Польшча ня мае.

2. АРГУМЭНТЫ ЭТНАГРАФІЧНЫЯ

Бадай найважнейшым аргумэнтам, да якой дзяржавы павінны належаць тыя ці іншыя землі, зьяуляецца аргумэнт этнаграфічны, іншымі славамі нацыянальны склад насельніцтва, што жыве на гэтых землях.

У дадзеным выпадку этнаграфічны аргумэнт поунасьцю прамауляе супраць польскіх прэтэнсыяу. Праўда, да апошняй сусьветнай вайны на тэрыторыі Заходняй Беларусі знаходзіуся значны працэнт насельніцтва польскае нацыянальнасьці, якая складалася у мяншыні з элемэнтау мясцовых - спалянізаванай на працягу вякоу беларускай арыстакрацыі й шляхты, і бальшыні із элемэнтау насланых за часоу належаньня Заходняй Беларусі да Польшчы - польскага чыноуніцтва й вайскавых асаднікау. Але калі-б, прыкладам. гэтыя палякі знаходзіліся там і сяньня, дык у ніякім выпадку ня було-б гэта вырашальным дзейнікам, бо тварылі яны сабой толькі нацыянальную меншасьць уморы каранного беларускага насельніцтва. Польскія урадавыя статыстыкі, што зводзілі беларусау у Заходняй Беларусі да колькасьці нацыянальнае меншасьці, ня могуць служыць ніякім аб'ектыуным жаралом, бо, як агульна ведама, былі яны сьведама фальшаваныя.

Але сяньня у сілу абставінау палякау зусім няма на тэрыторыі Заходняй Беларусі навет як нацыянальнай меньшасьці. На падставе умовы польскага ураду з урадамі БССР і УССР, усе палякі якія пражывалі на заходня-беларускіх і заходня - украінскіх землях, перасеныя у Польшчу. Больш таго! Многа навет беларусау, асабліва каталікоу падавалі сябе палякамі і як такія, таксама перасяліліся у Польшчу у надзеі што там уратуюцца ад калгаснага прыгону й тэрору МГВ,

Дык і этнаграфічны мамэнт не дае ніякіх падставау для польскіх прэтэнсыяу на заходня-беларускія землі.

3. МАТЫВЫ ПОЛІТЫЧНЫЯ

Ня гледзячы на усе аб'ектыуныя мамэнты. як гістарычныя, прауныя, этнаграфічныя й іншыя, у вызначэньні дзяржауных межау часта іграюць вырашальную ролю матывы чыста палітычнага характару. Сільныя гэтага сьвету не зауседы дагэтуль лічыліся з прыроднымі правамі паасобных народау на іхнае вольнае й незалежнае жыцьце, кідаючы іх ня раз у няволю іншых народау за кошт каньюнктурных, часта навет зманлівых палітычных выгадау, між іншым такімі трагічнымі ахвярамі палітыкі Захаду, што не хацелі лічыцца з нашымі нацыянальнымі правамі й патрэбамі сталіся й мы беларусы пасьля двух апошніх сусьветных войнау.

Вось-жа й палякі у сваіх прэтэнсыях на нашыя землі, здаецца, і разьлічваюць на такую палітычную сытуацыю, што заходні сьвет легка пагодзіцца на аднауленьне польскіх усходніх межау з 1939 г. Такая сытуацыя, на думку палякау, магла-б заіснаваць тады. калі-б Захад быу змушаны пагадзіцца на зварот Нямеччыне ейных усходніх земляу, што уваходзяць сяньня у склад Польшчы .Натуральнай рэкампэнсатай за «адзысканыя» цяпер палякамі землі на Захадзе быу-бы тады зварот страчаных імі земляу на усходзе. Таму увесь сяньняшні крык польскай прапагаганды за зварот Вільні й Львова й мае на мэце прыгатаваць апінію Захаду на сваю карысьць на мамэнт перабудовы эурапейскага Усходу.

Аднак надзеі палякау на здабыцьце прыхільнасьці адказных палітычных дзейнікау Захаду для сваіх неабаснаваных імпэрыялістычных прэтэнсыяу зьяуляюцца што найменш зманлівымі. Яны забываюцца, што Захад ужо боляй ня можа паддавацца ілюзіям, што можна устабілізаваць на даужэйшы час міжнародныя узаемадачыненьні коштам патаптаньня волі паасобных народау і іхных прыродных правоу, бо як раз такая палітыка давяла да другой сусьветнай вайны й цяперешняга канфлікту на Усходзе, які зьяуляецца першым актам трэйцяй сусьветнай вайны. Захад ужо у вялікай меры зразумеу, а есьць падставы спадзявацца, што хутка зразумее поунасьцю, што адзінай зарукай ягонай трывалай перамогі можа быць толькі такая палітыка, у якой прапагаваныя ім ідэі будуць адказваць ягоным дзеяньням.

А гэтымі ідэямі Захаду есьць дэмакратычныя ідэі пашанаваньня волі й нацыянальных правоу усіх народау на іхнае вольнае й незалежнае жыцьце.правоу, што знайшлі свае выражэньне на балонах Атлянтычнае Хартыі й іншых вялікіх дакументау сучаснасьці. Змагаючыся супраць расейска-бальшавіцкага імпэрыялізму, Захад ня можа адначасна падгрымліваць імпэрыялістычных дамаганьняу іншых народау, у дадзеным выпадку народу польскага.

(Працяг на 4 балонцы)

ней праз ягоных вучняу гэтае майстэрства пашырылася ня толькі па усей Беларусі, але й далека за яе межамі—у Маскоушчыне, на Украіне і навет на Балканах.

У Маскву у палавіне XVI ст. едуць і адкрываюць там першую друкарню два Скарынавыя вучні: беларус Петра Мсьціславец і маскоускі дзяк Іван Федарау. Ды пасьля надрукаваньня першай кніжкі, падбураная манахамі-перапішчыкамі маскоуская чэрнь нападае на друкарню, нішчыць яе ды у канцы паліць увесь дом з кніжкамі й прыладамі. друкары ледзь уратаваліся ад сьмерці уцекамі у Беларусь.

Ды гэтая няудача не адбівае іх ад працы. Думка аб друкаваньні кніжак, перанятая ад Скарыны, не дае ім супакою. Яны шукаюць матарыяльнай сабе помачы, каб весьці друкарскую справу далей. Мсьціславец з помаччу беларускага магната Хадкевічча арганізуе у 1568 г. друкарню у Заблудаве пад Беластокам, а Іван Федарау едзе на Украіну, у Львоу і закладае першую друкарню на украінскіх землях. Пазьней вандруе ен аж на Балканы і там пашырае друкарскую справу.

Ува усіх гэтых новазарганізаваных друкарнях новыя друкары працуюць паводля першаякасных узорау свайго вучыцеля Скарыны. Яны кап'юють ягоны шрыфт, пераймаюць ягоныя друкарскія аздабленьні, навет ягоны друкарскі знак—сонца зь месяцам у маладзіку, перадрукоуваюць нанава ягоныя, пераклады.

Не прайшло й паувеку, як Скарынавым прыкладам начынаюць на усей Беларусі закладацца адна друкарня за другою. А нейкіх сто гадоу пазьней усе беларускія землі пакрываюцца ужо адносна густою сеткаю друкарняу. Тыя-ж манахі—перапішчыкі, якія раней дзеля канкурэнцыйных меркаваньняу варожа настауляліся да першай друкарні, цяпер самі вучацца друкарства й пачынаюць арганізоуваць па манастырох друкарні.

У самой Вільні прыблізна 50 гадоу пасьля выхаду Скарынавага «Апостала», у 1574 г., паустае моцная, як на тую пару, выдавецкая фірма братоу Мамонічау, якая друкуе ужо ня толькі рэлігійныя, але й усялякія іншыя кнігі. У гэтай друкарні між іншым друкавауся й наш слауны збор законау г. ав. «Літоускі Статут», у сваім трэйцім, рэдагаваным канцлерам Львом Сапегаю, выданьні,

Дык хаця пры жыцьці самота Скарыны й выглядала, што ягоная думка заламалася, аднак пасьля ягонай сьмерці пакладзеныя натугі далі багаты ураджай ня толькі у Беларусі, але й па усей праваслаунай Славяншчыне.

Таму удзячнасьць нашаму слаунаму суродзічу належыцца сяньня ня толькі ад нас беларусау, але й ад усіх тых народау, друкарства да якіх было некалі першы раз занесенае няутомнымі вучнямі гэтага вялікага палачаніна.

———

Вельмі характэрныя адносіны да нашага Скарыны бальшавіцкае Масквы. Падчас жорсткага перасьледваньня усякіх праявау беларускай культуры й нішчэньня г. зв. нацдэмаушчыны перад апошняю вайною, Скарына быу выкляты, як нацыяналісты й контррэвалюцыянэр, пра яго было забаронена й успамінаць. З загаду Масквы з усіх падручнікау беларускае літаратуры й гісторыі быу выкінуты усялякі успамін аб ім. Яго ахрысьцілі «ворагам народу», хаця усе свае жыцьце Скарына служыу не для багатых, а «найболей-жа тым, што у бедах і клопатах знайходзяцца». І гэта рабілася у тую пару, калі славіліся Аляксандры Неускія, Іваны Грозныя, Петры Вялікія, Суворавы й іншыя «рэвалюцыйныя» героі імпэрыялістычнае Масквы.

Калі Скарына некалі як сьвятасьць вялікую вез з чужыны на бацькаушчыну веду друку, каб пры яго помачы шырыць сярод свайго народу культуру й асьвету, прауду й веду, пачуцьце любові да сваей зямлі, сваей мовы, любоу да волі й свабоды, дык сучасныя крывавыя валадары Беларусі выкарыстоуваюць гэты-ж вялікі вынаход людзкасьці для зусім адваротных, праступных мэтау. Праз свой друк яны ужо ад самага маленства намагаюцца затравіць у людзкой душы імкненьне да волі, стараюцца спаралізаваць чалавечую годнасьць ядам рабскай паслухмянасьці і рабскай уніжанасьці. Яны сваім друкам намагаюцца угаварыць народу, што тыранія з канцлагерамі й катаргамі, якую завялі, што новы калгасны прыгон—гэта й есьць сацыяльная справядлівасьць, нацыянальная свабода.

Ды у гісторыі яшчэ ня было выпадку, каб няволя была вечнаю. Ідучы за Скарынаю й зьвяртаючыся за прыкладам да Біблії, трэба сказаць. што й для нас, як і іншых народау вялікага сяньняшняга канцлягеру, прыйдзе некалі сьвяты урачысты дзень - дзень выхаду зь ягіпецкай няволі.

І тады удзячны вольны беларускі народ паставіць пышныя памятнікі свайму выдатнаму сыну, прасьветніку Беларусі доктару Францішку Скарыне. Памятнікі у першую чаргу там, дае гэты вялікі палачанін першы раз адкрыу свае вочы - над Палатой у Полацку, і там, дзе 425 гадоу таму аддрукавау першую кнігу на сваей роднай зямлі - у Вільн.

Сымон Брага.

Крывавы зьдзек над Беларускім народам

(Заканчэньне)

яльнай Першай Сэкцыі НКВД СССР». Камісія не задала сабе клопату праверыць гэтыя справы й устанавіць дакладную колькасьць замардаваных людзей. Апрача гэтага, загадчык Другой Сэкцыі Трэйцяга Аддзелу НКВД БССР Кацау заявіу Камісіі, што некаторая часьць справау была перасланая Кісялевым у вабласныя пракуратуры, копіяу якіх Кісялеу не пакінуу. Гэтых справау Камісія таксама не правярала. Дык калі-б падлічыць усе чыста ахвяры Кісялева, расстраляные на яго загад на працягу двух гадоу, дык іхная колькасьць напэуна у некалькі разоу перавысіла-б афіцыяльна пададзены лік — 13,325 асобау.

Пратакол дакумэнтальна пацьвярджае няведамаю у цэлым культурным сьвеце жахлівую сьледчую практыку савецкага НКВД. Гэтак Камісія устанавіла, што у бальшыні выпадкау Кісялеу адносіуся да справау абвінавачаных ім беларусау хаатычна, нядбала, а нярэдка сьведама фальшавау факты. І так успомнены ужо загадчык 2-ой Сэкцыі 3-га Аддзелу НКВД БССР Кацау сьцьвердзіу, што «да чэрвеня 1938 г. Кісялеу меу звычай падпісваць альбомныя даведкі (у якіх былі ужо вынесеныя прысуды абвінавачаным — Рэд.) перад тым, чымсьці пазнаеміцца із сьледчымі пратаколамі». Нярэдка ордэры на арышт былі выстауляныя на адныя асобы. а на аснове гэтых ордэрау арыштоуваліся зусім іншыя й караліся сьмерцю за праступкі. прыпісваныя першым. Прывядзем адзін із многіх прыкладау: «Ордэр на арышт быу выпісаны абласным пракурорам на Станіславу [illegible], народжаную у 1909 г., тады калі на аснове гэтага ордэру была арыштаваная Анеля Валер'янаўна Пляўінская, народжаная у 1894 г. Анеля Плявінская поунасьцю прызналася да стауляных ёй абвінавачаньняу, што належыла да «ПОВ», за што была прысуджаная да найвышэйшае меры пакараньня.

Пратакол адкрывае цэлы рад выпадкау, калі людзі былі пакараныя сьмерцю за праступкі, якія ня толькі ня былі сьледзтвам устаноуленыя, але у якіх арыштаваныя навет зусім не абвінавачваліся. Вось два із многіх доказау гэтага.

1. «Справа Но. 30463 абвінавачанага Адама Васільевіча Дворака. У альбомнай даведцы паказана, што Дворак атрымау даручэньне зьбіраць шпіенскія інфармацыі аб вайсковых адзінках Работніцка-Сялянскай Чырвонай Арміі і на выпадак вайны між Польшчаю й Саветамі прыняць удзел у збройным паустаньні, выконваючы дывэрсійныя акты у тылох Работніцка-Сялянскай Чырвонай Арміі. У паказаньнях Дворака, як у матарыялах справы наагул няма ані слова аб усім гэтым».

2. «Справа Но. 29581 абвінавачанага Язэпа Сьцяпанавіча Несьцяровіча. У альбомнай даведцы пададзена, што абвінавачаны брау удзел у нелегальных зборках кіраунікоу контррэвалюцыйнай арганізацыі «ПОВ», дзе былі абгаварваныя праблемы дывэрсыйнай і тэрарыстычнай дзейнасьці. У пратаколе справы аднак, няма абсалютна нічога аб гэтым».

У вельмі многіх, можна сказаць масавых выпадках беларускую нацыянальную прыналежнасьць арыштаваных беларусау мэханічна зьмяняу Кісялеу на польскую. Вось некалькі із многіх дадзеных Пратаколу:

«Справа Но. 133390 абвінавачанага Міхаіла Міхайлавіча Малевіча. Згодна усіх дакумэнтау ен уважаецца беларусам, але згодна альбомнае даведкі ен есьць паляк».

«Справа Но. 29777 абвінавачанага Канстанціна Сяменавіча Лісоускага. У альбомнай даведцы цьвердзіцца, што абвінавачаны зьяуляецца паляком, а паводля сацыяльнае прыналежнасьці — кулаком. У запрауднасьці, аднак Лісоускі есьць беларусам. селянікам-бедняком і, у дадатку, зусім няпісьменным».

«Справа Но. 13390 абвінавачанага Аляксандра Сяменавіча Руткоускага У альбомнай даведцы гаворыцца, што Руткоускі есьць паляком, тады, калі згодна усіх іншых фактау справы ен есьць беларусам.»

Справа Но.32750 абвінавачанага Івана Іванавіча Завілейскага. У альбомнай даведцы ен уважаецца паляком і кулаком, а у запраудпасьці есьць ен беларусам і работнікам-сталяром.

«Справа Но. 44185 абвінавачанага Паулы Адамавіча Янушэускага. Пятра Віктаравіча Караткевіча і Мікалая Гіпалітавіча Браткоускага. Ува усіх дакумэнтах яны фігуруюць, як беларусы а у альбомных даведках, як палякі». І г.д., і г.д.

Матывау перарабляньня беларускае нацыянальнасьці на польскую адгадаць ня цяжка. Вялізарная колькасьць арыштаваных абвінавачваюцца Кісялевым у польскім шпіянажы і у прыналежнасьці да няіснуючай у Беларусі «ПОВ» — Польская Вайсковай Арганізацыі. Але паколькі у абвінавачаньнях НКВД такая арганізацыя дзеіла, яна мусіла мець і сваіх сяброу. Так як у Усходняй Беларусі палякау было зусім нязначная колькасьць і наколькі нялегічным было-б прыпісваць беларусам належаньне да польскае арганізацыі, дык Кісялеу знайшоу просты з гэтага выхад; назвау патрэбную колькасьць арыштаваных ім беларусау палякамі і гэткім чынам свае заданьне перад Масквой выканау. Агульна ведама: што калі Масква дае загад арыштаваць адпаведную колькасьць людзей, дык нярэдка згары вызначае, які павінен быць нацыянальны склад арыштаваных.

Але найбольш цынічнымі есьць абурэньні аутарау Пратаколу супраць таго, што пры сьледчых допытах прымяняліся Кісялевым біцьце й іншыя спосабы фізычнага узьдзеяньня, у вывіку чаго сдараліся выпадкі забіцьця на сьмерць арыштаваных. Гэта-ж у Савецкім Саюзе навет кажнае дзіця ведае, што вымушаньне прызнаньня да ня зробленай віны пры помачы найбольш вырафінаваных спосабау фізычнага катаваньня зьяуляецца агульнапрынятай штодзеннай практыкай савецкага сьледзтва.

Ня менш таксама цынічным і фальшывым есьць абурэньне «Кантрольнай Камісіі» супраць таго, што Кісялеу пры помачы катаваньня сваіх ахвярау змушау іх да фальшывых удаваньняу і даносау на іншых, якія на гэтай падставе былі арыштоуваныя й расстрэльваныя. У Пратаколе між іншым чытаем: «Такім чынам, адзін з абвінавачаных, Міхаіл Ізаакавіч Александровіч данес у сваіх паказаньнях на 121 асобу, іншы абвінавачаны Сямен Міхайлавіч Якубовіч удзу 104 асобы, Павал Герасімавіч Бобунак 107 асоб, Іван Сьцяпанавіч Вольвате і Сямен Кіравіч Баух 120 асоб кажны, Барыс Вячаслававіч Снарыгін 241 асобу, Фома Фоміч Жылінскі 244 асобы і Браніслау Адамавіч Таранікевіч 249 асоб».

Але-ж змушаньне да даносау і удаваньняу, пры гэтым фальшывых, пры помачы фізычнага тэрору зьяуляецца чарговым агульна — прынятым мэтадам савецкага сьледзтва.

«Кантрольная Камісія», абвінавачваючы усе падпарадкаванае Кісялеву Кіраунцтва НКВД БССР у тым, што ягоная дзейнасьць «была кіраваная на вынішчэньне найлепшых савецкіх людзей», адначасна сьцьвярджае, што »у той самы час гэтае варожае кіраунцтва старанна абараняла перад арыштам многіх запраудных і найгоршых ворагау народу». Гэтае сьцьверджаньне есьць ня чым іншым, як выразнай дырэктывай для наступнікау Кісялева, заданьнем якіх, пэуне-ж, было вылавіць і зьнішчыць тых запраудных і найгоршых ворагау народу», якіх быццам прыхоувау Кісялеу. Іншымі словамі гаворачы, і пасьля зьнішчэньня Кісялева будзе й далей шалець у Беларусі крывавы тэрор НКВД з масавымі арыштамі. ссылкамі. расстрэламі...

Толькі людзі злое волі або пазбауленыя здаровага разуму могуць паверыць, што Масква, пасылаючы у Менск «Кантрольную Камісію» дзеля праверкі дзейнасьці Кісялева, рабіла гэта із шчырым намерам устанавіць на Беларусі справядлівасьць ды пакараць вінаватых. Ніхто таксама не праводзячы на Беларусі на працягу двух гадоу крывавую расправу над беларускім народам, мог рабіць гэта на собскую руку бязь ведама і згоды Масквы.

Пры савецкай сыстэме шпіянажу, перад якім звычайна нічога ня можа утаіцца, які пранікае навет у прыватныя справы людзей, есьць выключанай справай, каб Масква ня ведала, што дзеілася на працягу цэлых двух гадоу у Беларусі. Прагаварылася у гэтым і сама «Кантрольная Камісія», калі сьцьвердзіла, што вялікая колькасьць актау Кісялева не магла быць ею праверана. бо яны былі перасланыя Кісялевым у Маскоускае НКВД. Значыцца Масква была у поуным курсе усяго таго, што дзеілася у Беларусі.

Дык можа зьявіцца пытаньне. для якой мэты Масква пасылала у Беларусь сваю «Кантрольную Камісію» й праводзіла сьледзтва дзейнасьці Кісялева?

Калі прасочым галаунейшыя этапы масавага тэрору у Саветах, дык адказ на гэтае пытаньне прыйдзе сам сабой. Крэмль, каб адгарадзіць сябе ад праступкау, дакананых ім над народам звычайна прыпісвае іх таму, хто іх на загад Крамля непасрэдна праводзіу у жыцьце, удаючы пры гэтым што ані Сталіну, ані іншым савецкім правадыром нічога аб гэтым ня было ведама. Такая тактыка Крамля паутаралася, як правіла, пасьля кажнай масавай тэрарыстычнай акцыі у Саветах. Гэтак усе крэмлеускія праступкі за часоу усесаюзнага кірауніка ГПУ—НКВД Ягоды былі яму-ж і прыпісаныя, за што быу ен у 1936 расстраляны. Гэтак пазьней у 1938 г. быу зьнішчаны наступнік Ягоды Ежоу за масавыя расстрэлы на тэрыторыі усяго Савецкага Саюзу, праводжаныя ім на загад Крамля. Гэтак былі прызнаныя ворагамі народу й зьнішчаныя кіраунікі НКВД БССР Бэрман, Наседкін Гэпштэйн і іншыя за іхную тэрарыстычную акцыю над беларускім народам, праводжаную быццам бязь ведама і супраць волі Масквы Гэтак, напасьледак, быу зьнішчаны й Кісялеу.

Такім чынам »Кантрольная Камісія« была высланая у Беларусь толькі па тое, каб даказаць, што у вынішчэньні беларускага народу Масква нявінаватая, а вінаватыя толькі Кісялеу і ягоныя супрацоунікі, якія, будучы замаскаванымі ворагамі народу, сьведама дзеілі на шкоду савецкай улады У «Вывадах» «Кантрольнай Камісіі» вельмі красамоуна аб гэтым сказана: «Цераз сваю крымінальную безадказнасьць Кісялеу памагау былому варожаму кіраунцтву НКВД БССР (Бэрман, Наседкін Стаяноускі, Гэпштэйн і другія (з мэтаю праводжаньня у жыцьце кантррэвалюцыйнай дзейнасьці,скіраванай на вынішчэньне найлепшых савецкіх людзей».

Але дарма! Вышэй прыведзеныя довады не пакідаюць найменшага сумліву у тым, што Кісялеу быу толькі сьляпым выканаўнікам і паслухмяным аружжам у руках Масквы. За Кісялевым стаіць сам Сталін, увесь Крэмль і увесь расейскі бальшавізм.

Жахлівыя факты, што раскрываюць перад намі тайныя савецкія дакумэнты, есьць яшчэ адной Віньніцай і яшчэ адным Катынам, ахвярамі якіх былі тысячы бязьвінных беларусау. Толькі беларусау. Толькі калі праступкі Катына й Віньніцы бальшавікі намагаюцца за усякую цану, зь сябе скінуць наіуна прыпісваючы іх немцам, то з масавым забойствам беларускага народу зрабіць ім гэтага ня удасца. Тайныя дакумэнты ганебна кампрамітуючыя Крэмль у вачох цэлага сьвету, знаходзяцца сяньня у беларускіх руках. Яны зьяуляюцца найлепшым абвінавачаньнем крэмлеускіх катау на чале із Сталінам за масавыя забойствы Беларускага Народу.

НЕАБАСНАВАНЫЯ ПРЭТЭНЗІІ

(Заканчэньне)

Калі-ж аднак апошняя трагэдыя польскага народу, што была у вялікай меры вынікам несправядлівае нацыянальнае палітыкі даваеннае Польшчы, нічога яшчэ не навучыла польскіх палітыкау, што імкнуцца пашырыць межы сваей бацькаушчыны за кошт вольнасьці й незалежнасьці беларускага й украінскага народау, дык гэта можа толькі прынесьці шкоду самым палякам. Гэткім сваім наступаньнем яны сабе выстауляюць ня вельмі завідны атэстат у вачох вольнага й дэмакратычнага сьвету.

Аднак усякая прапаганда, хоць-бы навет і найбольш залганая; можа выклікаць фальшывае уяуленьне сярод мала зарыентаваных у запраудным палажэньні справы масау Захаду, калі яна будзе умела й сыстэматычна праводзіцца й ня будзе напатыкаць на супрадзеяньне з праціунага боку. Найлепшым гэтага доказам можа служыць прапаганда бальшавіцкая, якая да апошняга часу рабіла вялізарны уплыу на публічную думку заходняга насельніцтва. Таму мы, беларусы й украінцы не павінны аставацца бязьдзейнымі у мамэнт напружанай польскай прапагандовай акцыі, скіраванай на нашую шкоду. На польскую прапаганду мы павінны адказаць нашай контрпрапагандай, тым больш, што усе факты й аргумэнты гавораць толькі у нашую карысьць.

У вадказ на польскія «зьвензкі одзыскання зем полноцно—всходніх» павінен паустаць Саюз Абароны Земляу Заходняй Беларусі й Заходняй Украіны». заданьнем якога была-б параліжаваньне польскай прапаганды й абзнаямленьне шырокіх колау Захаду із запраудным станам рэчау. Гэтае супрацьдзеяньне павінна праводзіцца супольна беларусамі й украінцамі, як народамі, супраць якіх есьць непасрэдна скіраваная польская акцыя,

Некаторыя украінскія колы мусілі-б з намі згадзіцца, што летувісы, як эвэнтуальны трэйці партнэр у гэтай контракцыі, не павінны тут брацца зусім пад увагу, бо гэта толькі заблытала-б усю справу й надало-б ей непаважны характар. Гэта таму, што палякі зусім ня прэтэндуюць на летувіскую тэрыторыю, калі ня браць пад увагу тых некалькіх валасьцяу, у Сьвянцянскім і Віленска-Троцкім павете, што увахсдзілі перад 1939 г. у склад польскае рэспублікі. Але беларусы ня мелі й ня маюць нічога супраць таго, каб гэтыя валасьці адыйшлі да Летувы.

Затое летувіскія прэтэнсыі да Вільні й Віленшчыны ані чуць ня розьняцца ад польскіх прэтэнсыяу да Вільні й Львова, і зьяуляюцца толькі недасьпелым плодам летувіскіх імпэрыялістычных хаценьняу.

Дык два братнія народы—беларусы й украінцы павінны задзіночыць свае сілы, каб даць належны адпор наглым праявам польскага імпэрыялізму.

Алесь Крыга.

Будзьма гатовымі?

(Пачатак на 1 балонцы)

залежнасьці беларускага народу. І можна сьмела уважаць. што калі мы у мамэнт эвэнтуальнага збройнага канфлікту астанемся безьдзейнымі, то беларускі народ бясспрэчна станецца ахвярай незаспакоеных імпэрыялізмау некоторых пашых суседзяу.

Вось-жа адказныя беларускія палітычныя дзейнікі павінны сяньня поунасьцю усьведамляць сабе гэтую сытуацыю і ужо цяпер весьці інтэнсыуную палітычную й прапагандовую дзейнасьць, каб усьведамляць адказныя палітычныя дзейнікі Захаду аб нашых запраудных патрэбах і пашых прыродных нацыянальных імкненьнях. Неабходна пераканаць Захад, што адбудаваньне вольнай і незалежнай Беларусі побач зь незалежнымі дзяржавамі іншых заняволеных сяньня народау будзе наймацнейшай гарантыяй міру на Усходзе.

З другога боку беларускія эміграцыйныя масы у ва усім сьвеце павінны быць сьведамыя факту, што на выпадак збройнага канфлікту на эурапэйскім Усходзе іхнае месца мусіць быць у радох змагароу з маскоускім камунізмам.

Бо вольнасьць і незалежнасьць Бацькаушчыны можна здабыць толькі у актыуным змаганьні з ворагам.

Язэп Каранеускі.

МАГЧЫМАСЬЦІ ВЫЕЗДУ У АНГЕЛЬШЧЫНУ

Дзякуючы стараньням Згуртаваньня Беларусау у Вялікабрытаніі існуюць магчымасьці індывідуальнае эміграцыі беларусау зь Нямеччыны у Ангельшчыну за пасярэдніцтвам і пры помачы вышэйуспомненага Згуртаваньня. Жадаючыя выэміграваць у гэтую краіну павінны безадкладна прысланць у Беларускі Нацыянальны Камітэт у Нямеччыне заявы з наступнымі дадзенымі для усіх сяброу сям'і:

1). Імя й прозьвішча (для жонкі таксама й дзявочае прозьвішча).
2). Ступень сваяцтва сяброу сям'і у дачыненьні да галавы сям'і.
3). Чысло і месца нараджэньня.
4). Прафэсыя.
5). Цяперашні адрас.

Заявы просім пересылаць на адрас Адміністрацыі «Бацькаушчыны».

Часапіс Беларускага Навуковага Таварыства імя Францішка Скарыны «Веда»

Выйшау з друку у ЗША № 1 часапісу Беларускага Навуковага Таварыства імя Францішка Скарыны «Веда». Часапіс можна выпісаць з Адміністрацыі «Бацькаушчыны». Цана аднаго эгзэмпляра разам зь перысылкою—1 марка, безь перасылкі—80 фэн.

Жыхары Бад-Айблінгу у дзень сьвята «Слуцкага паустаньня» зламылі на газэту 32 Дм.

НАШЫЯ ПРАДСТАУНІЦТВЫ ПАЗА НЯМЕЧЧЫНАЙ

1. У Бэльгіі:
Mr. M. Vostrikau, 8, Place Hoover, Louvain, Belgique.

2. У Ангельшчыне:
Association Whiteruthenians of Grait Britain 52, Penn Road, Holloway, London, N. 7, England

3, У Францыі:
Mr. Nikolaj Lysucha, 8 R-Gambetta. St. Quen, Seine, France.

4. У ЗША:
Mr. Jan Stankievic, 325 East 100 Street, New-York 29, N.Y. U.S.A.

5. У Канадзе:
Mr. Joseph Pitushka, 131 Manning Ave. Toronto, Ont. Canada.

6. У Аргентыне:
Mierlak Konstantin, C. Rivadavia 1291, Buenos-Aires, Argentina.

7, У Аустраліі:
Mr. Nicolai Skabiej, 110 Grey Street, East Melbourne, Victoria, Australia.

Непасрэдна з гэтых прадстауніцтвау просім суродзічау выпісваць «Бацькаушчыну».